**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ**
**IX міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі**
**маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі**
**«ARS LONGA: НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ»,**
**якая адбудзецца 16–17 красавіка 2026 г.**

Запрашаем да ўдзелу маладых навукоўцаў, лабарантаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў старэйшых курсаў прэзентаваць свае даследаванні. Мы ўпэўнены, што правядзенне канферэнцыі паспрыяе развіццю прафесійных кантактаў паміж маладымі даследчыкамі і актывізуе творчы пошук.

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

1. Метадалогія гісторыі, гістарыяграфія, крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя навукі.
2. Даследаванні ў галіне археалогіі і антрапалогіі.
3. Гісторыя Беларусі.
4. Жанчыны ў гісторыі Беларусі.
5. Даследаванні ў галіне сусветнай гісторыі XIX–XXI стст.
6. Міжнародныя адносіны.

**Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі і тэксты дакладаў** прымаюцца да **10 сакавіка 2026 г.** на адрас arslonga2019@gmail.com.
**У заяўцы[1] паведамляецца** імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка; яго навуковая ступень і званне; назва даклада; назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык; пасада; кантактны тэлефон; e-mail; форма ўдзелу (вочная / завочная); неабходнасць афіцыйнага запрашэння. **Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі, не тлумачыць прычыны магчымага адхілення заявак і тэкстаў дакладаў.** Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да 20 сакавіка 2026 г.
***Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваныя.***

**Патрабаванні да тэкстаў**. Аб'ём артыкула не больш за 30 000 знакаў. Мова выкладу беларуская або руская, тэкст павінен адпавядаць крытэрам навуковасці і правілам арфаграфіі; даваць поўнае ўяўленне аб характары разгладаемай аўтарам праблемы. Тэкставы рэдактар Microsoft Word, шрыфт Times New Roman, 12 pt, інтэрвал – адзінарны, усе палі – 20 мм. У тэксце дапускаецца выкарыстанне адной ілюстрацыі (фармату TIFF або JPEG (пашырэнне не менш за 300 dpi). Ілюстрацыя дасылаецца ў асобным графічным файле, подпіс да яе змяшчаецца ў канцы тэкставага файла. Спасылкі ў тэксце згодна з патрабаваннямі ВАК *(гл. qr-код)*.

**Тэксты дакладаў студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў суправаджаюцца рэцэнзіяй навуковага кіраўніка і выпіскай з пратакола пасяджэння кафедры (аддзела).**

**Тэкст павінен утрымліваць наступныя элементы:**

• код УДК (размяшчэнне па левым баку);

*Прыклад: УДК 94:327.5(620:560)«183»:94:327.8(410+436+470+44)*

• назва артыкула (друкуецца вялікімі літарамі тлустым шрыфтам з размяшчэннем па цэнтры на беларускай / рускай мове (у залежнасці ад выкладу) і англійскай мове);

• ініцыялы і прозвішча аўтара (аўтараў) артыкула на рускай / беларускай і англійскай мовах (размяшчэнне па цэнтры);

• месца працы / вучобы, горад на беларускай / рускай і англійскай мовах (размяшчэнне па цэнтры);

• анатацыя да 10 радкоў, друкуецца курсівам на беларускай / рускай і англійскай мовах (выраўноўванне па шырыні);

[1] Падача заяўкі азначае згоду ўдзельніка на апрацоўку персанальных дадзеных.

• ключавыя словы друкуюцца курсівам на беларускай / рускай і англійскай мовах (да 10 слоў, аддзяляюцца адзін ад аднаго кропкай з коскай).

**Месца правядзення**: г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1 (Інстытут гісторыі НАН Беларусі).
Праезд і пражыванне ўдзельнікаў канферэнцыі ажыццяўляецца за кошт камандзіруючага боку.

**Мы будзем удзячны за распаўсюджванне інфармацыі аб канферэнцыі!**

*Кантактныя дадзеныя:*
Дзмітрый Лішай *E-mail:* arslonga2019@gmail.com
Дар’я Пыж